***Полацк – найстаражытнейшы горад Беларусі, які ў летапісах згадваецца пад 862 годам. Археалагічныя даследаванні Полацкага дзяржаўнага універсітэта ў старажытных частках Полацка пацвердзілі паведамленне летапісаў пра больш чым тысячагадовую яго гісторыю. На месцы будучага Полацка людзі жылі ўжо ў першай палове І тысячагоддзя да нашага часу, каля 780 года нашага часу ў Полацку славянскім насельніцтвам было заснавана пасяленне, якое ў XI стагоддзі пераўтварылася ў сярэдневяковы горад. Пачатковая крэпасць, якая была заснавана славянамі пры вусці Палаты на так званым полацкім гарадзішчы, стала тым ядром, вакол якога паступова разрасталіся гарадскія пасады. Менавіта пасадскае насельніцтва спрыяла пераўтва-рэнню летапіснага «града» крывічоў у сярэдневяковы горад у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміну. Полацкія рамеснікі і гандляры садзейнічалі пашырэнню сувязяў горада з Візантыяй і Скандынаўскімі краінамі, з Усходам і Захадам. Дзякуючы гэтым сувязям Полацк у XI – XVI стагоддзях з'яўляўся буйнейшым горадам на тэрыторыі Беларусі, у якім былі створаны ўсе неабходныя ўмовы для росквіту навукі і асветы, станаўленню непаўторнай полацкай школы дойлідства. Развіццё гістарычнай навукі на старажытнай Полацкай зямлі з'яўляецца неабходнай умовай для захавання і спасціжэння гісторыка-культурнай спадчыны самага старажытнага горада Беларусі. З 1999 года пачаліся яго штогадовыя археалагічныя даследаванні. Вывучэнне пасадскай структуры старажытнага Полацка з'яўляецца адной з прыярытэтных задач сучаснай гістарычнай навукі, што адлюстравана ў задачах Полацкай археалагічнай экспедыцыі на 2008 – 2012 гады ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.***

**УДК 947.6**

# ПОЛАЦКІ ПАСАД IX – XVII СТАГОДДЗЯЎ: ГІСТОРЫКА-ПАРАЎНАЎЧАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА[1]

***канд. гіст. навук, дац. Д.У. ДУК***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*На падставе звестак археалагічных і пісьмовых крыніц, а таксама абагульнення гістарыяграфічных даных у артыкуле разглядаюцца пытанні развіцця сацыятапаграфічнай структуры полацкіх пасадаў у IX – XVII стагоддзях. Дадзена характарыстыка паняцця «пасад», вызначаны час станаўлення полацкіх пасадаў, этапы развіцця іх сацыятапаграфічнай структуры і кіравання. Праведзены параўнаўчы аналіз з сінхроннымі працэсамі ў гарадах Паўночнай Русі (Віцебск, Ноўгарад, Пскоў). Зроблена выснова аб адсутнасці ў Полацку «канчанскай» структуры арганізацыі пасадскага насельніцтва, што адрознівае Полацк ад Ноўгарада, Пскова і іншых гарадоў Паўночнай Русі. Пазначаны этапы станаўлення гарадской абшчыны. Пацверджана думка, што юрыдычнае замацаванне мяшчанскай абшчыны адбылося пасля надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.). З гэтага часу і да канца XVII стагоддзя існавала соценная структура кіравання пасадскага насельніцтва.*

**Уводзіны.** Праблема вывучэння полацкага пасада не новая ў беларускай археалогіі. Прадметам даследаванняў беларускіх археолагаў, у першую чаргу Г.В. Штыхава, С.В. Тарасава, Н.І. Здановіч і інш., з'яўляліся пытанні тапаграфічнага развіцця, забудовы і планавання, а таксама матэрыяльнай культуры полацкіх пасадаў як асноўных горадаўтваральных частак сярэдневяковага горада. Тым не менш базавыя пытанні вызначэння і сутнасці паняцця «пасад» у дачыненні да урбаністычнай структуры Полацка засталіся па-за ўвагай даследчыкаў. Сітуацыя ўскладняецца тым, што ў айчыннай гістарыяграфіі адсутнічае адзіны погляд на вызначэнне часу станаўлення пасадскай структуры сярэдневяковых гарадоў Русі, а таксама існуе тэрміналагічная недакладнасць у вызначэнні раннегарадскога этапу станаўлення гарадскіх пасадаў.

Такім чынам, мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне паняцця «пасад» у дачыненні да працэсу станаўлення сярэдневяковага Полацка, а таксама характарыстыка сацыяльнай арганізацыі і кіравання пасадскага насельніцтва. Гісторыя станаўлення полацкага пасада вывучаецца ў кантэксце урбаністычнай культуры Паўночнай Русі як гістарычна роднаснага сацыякультурнага рэгіёна (Віцебск, Ноўгарад, Пскоў).

[1] Работа створана пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, грант Г08Р014 «Фарміраванне і развіццё сістэмы беларуска-расійскіх міжрэгіянальных кантактаў: сацыякультурны і эканамічны аспекты (Полацк, Віцебск, Ноўгарад, Пскоў; IX – XX стст.)».

**Дэтэрмінацыя паняцця «пасад».** Двухчасткавая структура кожнага старажытнарускага горада адпавядае схеме «дзяцінец (умацаваная крэпасць) – перадграддзе (пасад)» [26, с. 242; 27, с. 152]. Нярэдка тэрмін «перадграддзе» выкарыстоўваецца ў сінанімічным значэнні з тэрмінам «вакольны горад».

Уласна «пасад» – гэта гандлёва-рамесніцкая частка феадальнага горада, жыхары якой аб'ядноўваліся ў самакіруемую абшчыну. Наяўнасць у структуры пасялення гандлёва-рамеснага пасада з'ўляецца галоўнай прыкметай горада, якая адрознівае яго ад княжацкіх крэпасцей і феадальных замкаў-сядзіб [25, с. 106]. Характар рамесных заняткаў, гандлю і абшчынная арганізацыя вызначаецца індывідуальна для кожнага ўсходнеславянскага горада.

Пасадская структура старажытнарускіх гарадоў пачала фарміравацца ўжо ў IX стагоддзі і канчаткова сфарміравалася з набыццём пасяленнем функцыі сацыяльна-эканамічнага цэнтра акругі, уласна горада [26, с. 47].

І.Я. Фраянаў звярнуў увагу на разыходжанні ў гістарыяграфіі часу вызначэння станаўлення пасадаў старажытнейшых гарадоў Русі – ад IX да XI стагоддзя [29, с. 188]. Гісторык адмаўляе думку аб існаванні гарадскіх пасадаў раней XI стагоддзя, падкрэсліваючы асноўную функцыю пасадаў – цэнтра разгалінаванага рамяства і гандлю, якая не магла скласціся ў больш ранні час. Паводле І.Я. Фраянава, творцы свабоднага пасадскага рамяства – гэта вольныя людзі, якія пакідалі родавыя селішчы зямліволасці і сяліліся каля гарадскіх сцен. Аднак чым функцыянальна адрозніваліся пасады XI стагоддзя ад селішч-перадграддзяў больш ранняга часу? Існаванне гарадской абшчыны, разгалінаванай гарадской інфраструктуры і манументальных свецкіх і культавых пабудоў у ранні час існаваць, натуральна, не магло. Тым не менш селішчы-перадграддзі з'ўляліся асновай станаўлення паўнавартаснай пасадскай структуры горада, паколькі ўжо з моманту заснавання іх плошча значна перавышала плошчу дзяцінца, тут размяшчаліся рамесныя майстэрні і пражывала асноўная колькасць насельніцтва. Таму гісторыю станаўлення пасадаў Полацка і іншых найстаражытнейшых усходнеславянскіх гарадоў варта разглядаць з IX стагоддзя, калі вакол умацаванага града-крэпасці існаваў вакольны горад. Адзінымі крытэрыямі для яго вызначэння з-за адсутнасці пісьмовых крыніц з'яўляюцца археалагічныя даныя.

Тэрмін «вакольны горад» азначае асаблівую горадабудаўнічую структуру, якая ў адных выпадках бліжэй да дзяцінца, у другіх – да гандлёва-рамеснага перадграддзя [27, с. 156]. Уласна пад назвай «вакольны горад» разумеецца тэрыторыя побач з дзяцінцам, абнесеная валамі, равамі і крапасной сцяной, якая ўтварае другую лінію гарадскіх умацаванняў. Вакольны горад – папярэднік існавання пасадаў у протагарадскі (дафеадальны) час. Адпаведна з рэаліямі развіцця раннегарадскіх пасяленняў вакольны горад мог пераўтварыцца ў пасад у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміну.

З канца XII стагоддзя перадграддзі-пасады асобных старажытнарускіх гарадоў пачынаюць дзяліцца на больш дробныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі – канцы (Ноўгарад, Пскоў, Растоў, Ладага, Старая Руса, Смаленск) [27, с. 160]. Увогуле слова «пасад» часцей сустракаецца ў пісьмовых крыніцах пры апісанні гарадоў Паўночнай Русі (упершыню фіксуецца ў Ноўгарадзе пад 1234 г., у Полацку – толькі ў 1552 г. [22][2]). Тэрмін «перадграддзе» (у сэнсе «пасад») больш характэрны для паўднёвых гарадоў Русі [26, с. 242]. Гэта цалкам карэлюецца з традыцыйнай для гарадоў Русі схемай проціпастаўлення астрога дзяцінцу, г. зн. умацаванай частцы горада, дзе жыў князь з малодшай дружынай («княжымі дзецьмі»), ці так званага «ўнутранага горада» – «днешнего града» [17, с. 224]. Функцыя дзяцінца – абарона не толькі князя, але і пасадскага люда ў часы ваеннай небяспекі.

**Станаўленне тапаграфічнай структуры полацкіх пасадаў.** Асноўныя горадаўтваральныя пасады Полацка – Вялікі і Запалоцкі – пачалі фарміравацца ў XI стагоддзі. На думку П.П. Талочкі, назва асноўнай тапаграфічнай адзінкі Полацка – «Вялікі пасад» – сведчыць пра наяўнасць «малога пасада», якім з'яўляўся ўмацаваны вакольны горад пачатковага Полацка [27, с. 157]. Гэты «малы пасад» размяшчаўся на тэрыторыі, якая з поўдня прымыкала да першапачатковага гарадзішча (селішча, ці «перадграддзе», адкрытае С.В. Тарасавым у 1986 г.). Таксама тэрыторыя «малога пасада» ўключала і старажытнае «перадграддзе» на правым беразе Палаты плошчай 0,24 га [31, с. 9]. Згодна з удакладненымі данымі, сумарная плошча гэтага «малога пасада» да сярэдзіны XI стагоддзя складала каля 12 га [7, с. 166 – 167]. Такім чынам, існаванне назвы «малы пасад» з'ўляецца вельмі верагоднай, але яна магла ўзнікнуць не раней за XI стагоддзе.

У пачатку XI стагоддзя на правым беразе Палаты ўтвараецца Запалоцкі пасад [10]. У сярэдзіне XI стагоддзя яго плошча была не меньш за 40 га, што больш чым у 3 разы болей за плошчу вакольнага горада («малога пасада» XI ст.). Запалоцкі пасад быў умацаваны і актыўна забудоўваўся ўздоўж Дзвіны ў заходнім накірунку, забудове вакольнага горада на ўсход ад старажытнага гарадзішча і Верхняга замка перашкаджаў буйны курганны некропаль [8]. У пачатку XIII стагоддзя Запалоцкі пасад удвая скараціўся ў памерах і дасягнуў плошчы каля 20 га, у той жа час забудова вакольнага горада крочыла далей за мяжу ўмацаванняў першай паловы XI стагоддзя і спыніла тэрытарыяльны рост на плошчы каля 50 га. Відаць, у гэты час і з'явілася назва «Вялікі пасад», якая замацавалася за тэрыторыяй ад старажытнага гарадзішча да Верхняга замка, уключаючы і былы вакольны горад.

[2] Дагэтуль выкарыстоўвалася альтэрнатыўная назва пасада – астрог [23, с. 8].

Важнае значэнне «торга», ці «места», неаднаразова падкрэслівалі гісторыкі ў вызначэнні сацыятапаграфічнай структуры старажытных гарадоў. «Местам» называлі ўсю гандлёвую плошчу на пасадзе, па гэтай прыкмеце і ўсю тэрыторыю горада называлі «местам»[3] (адсюль – «мяшчане», ці «месцічы», якія ў Полацку ўпершыню згаданы ў інтытуляцыі гарадскіх зваротаў пад 1459 г.[4]) [25, с. 107]. Паказальна, што ў XV стагоддзі «мяшчанамі» называлі жыхароў горада, якія займаліся гандлем [20, с. 64].

Пачатковы дзяцінец Полацка размяшчаўся на полацкім гарадзішчы з 780 года [14]. Функцыі дзяцінца Верхні замак прыняў на сябе пасля спынення існавання княжацкай рэзідэнцыі на гарадзішчы і пабудовы замкавых умацаванняў, г. зн. не раней за XIV стагоддзе [13, с. 28 – 29]. Адміністрацыйны цэнтр горада пасля надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.) і пабудовы гарадской ратушы (пасля 1509 г.) быў перанесены на гарадскую плошчу [11, с. 38]. У сярэдзіне XVII стагоддзя Верхні замак згадваецца пад найменнем «вялікі горад» [5, с. 273].

Межы і плошча пасадаў на левым беразе Дзвіны археалагічна не вызначаны. Найбольш аддаленым ад гістарычнага цэнтра Полацка быў Экіманскі пасад. Ён знаходзіўся на левым беразе Дзвіны на захад ад Востраўскага пасада. Паводле Рэвізіі 1552 года на левым беразе Дзвіны існавалі чатыры (разам з Востраўскім і Экіманскім) пасада: Крыўцоў і Слабодскі. Пачатак станаўлення левабярэжных пасадаў прыпадае прыкладна на XIV стагоддзе [23, с. 39]. У першай трэці XVII стагоддзя на левым беразе Дзвіны існаваў адзін пасад, які меў назву Крыўцоў [11, с. 33 – 38]. На гэтым пасадзе размяшчалася «мястэчка», у сэнсе «мясцовасць», Бельчыцы-Кабак, ці Бельчыцкая слабада.

У 1622 – 1623 гадах мяшчане Крыўцовага пасада сталі падначаленымі полацкаму магістрату, г. зн. сталі паўнапраўнымі гараджанамі. У дачыненні да Экімані ў сярэдзіне XVI стагоддзя ўжываецца адначасова назва «пасад» і «прадмесце», у XVII стагоддзі выкарыстоўваецца назва «мястэчка» і «факторыя». Гэта далёка не выпадкова. Экімань была перададзена Стэфанам Баторыем езуіцкаму калегіуму, з’яўлялася разам з Востравам яго найбуйнейшай юрыдыкай і паводле земскіх кніг з канца XVI стагоддзя мела статус полацкага прадмесця, аднак жыхары Экімані ў XVII стагоддзі па-ранейшаму лічыліся мяшчанамі [11, с. 33 – 38].

Для маркіроўкі лакальнай прыналежнасці насельніцтва Полацка ў сярэдзіне XVII стагоддзя карысталіся азначэннямі «заполочане» (жыхары Запалоцкага пасада), «заречане» (жыхары левабярэжнай часткі Полацка ўвогуле), «кабачане» (жыхары мясцовасці Кабак). Кабачане па-ранейшаму вылучаліся асобна з агульнай колькасці задзвінскага насельніцтва [11, с. 33 – 38].

Такім чынам, сукупнасць археалагічных і пісьмовых крыніц дазваляе выказаць меркаванне, што ў Полацку першай паловы XVI стагоддзя існавалі два асноўных горадаўтваральных пасады – Вялікі і Запалоцкі. Гэтыя пасады размяшчаліся на правым беразе Дзвіны, Запалоцкі – на захад ад вусця Палаты, Вялікі – на ўсход ад Верхняга замка. Абодва пасады былі ўмацаваны. Плошча Вялікага пасада заставалася практычна нязменнай на працягу XII – XVII стагоддзяў і складала каля 50 га, межы Запалоцкага пасада істотна вагаліся ў бок скарачэння, што было звязана з частымі войнамі з Маскоўскім княствам. Аднак нават у самыя неспрыяльныя часы плошча Запалоцкага пасада наўрад ці была меней за 17 га. Менавіта на гэтым пасадзе быў заснаваны першы ў Полацку каталіцкі кляштар бернардзінцаў [12].

**Сацыяльная арганізацыя пасадскага насельніцтва: агульнае і адметнае.** Да сярэдзіны XII стагоддзя летапісы не паведамляюць пра існаванне «канчанскай» структуры асобных старажытнарускіх гарадоў. Тэрмін «пасад» згадваецца яшчэ пазней – у 1234 годзе, што сведчыць пра раннефеадальны характар развіцця гарадоў у IX – сярэдзіне XII стагоддзя. Паводле П.П. Талочкі, у гэты час гарады яшчэ былі адносна невялікімі ўтварэннямі і іх унутраная адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура яшчэ не набыла завершаныя формы [27, с. 144].

Тэрмін «канец»[5] упершыню згаданы ў дачыненні да адной адміністрацыйна-тэрытарыяльнай часткі Кіева пад 1147 год, у Ноўгарадзе «Неревский конец» згаданы пад 1172 год. Акрамя Кіева і Ноўгарада, канчанская структура была характэрна для Пскова, Растова, Ладагі, Старай Русы, Смаленска [27, с. 144 – 145]. Погляды на сацыяльную арганізацыю канцоў сярод гісторыкаў розняцца: канчанская структура прадугледжвала наяўнасць залежнага ад баярства гандлёва-рамеснага насельніцтва [27, с. 147] альбо была заснавана на прынцыпах федэралізму і народаўладдзя [28, с. 21]. Напрыклад, канцы Ноўгарада былі найбольш буйнымі структурнымі адзінкамі горада са сваім вечам і выбарнымі начальнікамі. Кожны канец уключаў у сябе больш дробныя падраздзяленні – вуліцы і сотні. Гарадская абшчына «канцоў» была цесна звязана з сельскай акругай [28, с. 17, 31].

Аднак, як пераканаўча паказаў П.П. Талочка, веча не толькі з’яўлялася органам абшчыннай улады, яно было створана для яе падаўлення [27, с. 206]. Баярская карпаратыўнасць наўгародскіх канцоў яскрава

[3] Тэрмін «место Полоцкое» ўпершыню згадана ў канцы 40-х гадоў XV стагоддзя [20, с. 64].
[4] М.Д. Макараў і А.Г. Харашкевіч вызначаюць больш ранні час – 30-я гады XV стагоддзя [20, с. 63].
[5] Тэрмін выкарыстоўваўся ў азначэнні да розных раёнаў перадграддзя ці вуліц асобных старажытнарускіх гарадоў. Тэрмін інтарпрытуецца па-рознаму: як тапаграфічная адзінка [27, с. 144 – 145], як месца, на якім адбываўся сход абшчыннікаў, альбо сукупнасць уладанняў абшчыны (ад слова «конъ» – сходка) [28, с. 28 – 29].

прасочана ў сацыяльным складзе іх насельніцтва. Насельніцтва канца складаецца з баяр і непасрэдна залежных ад іх людзей, якія жывуць на баярскіх сядзібах – вотчынных рамеснікаў, чэлядзі, клірыкаў; для апошніх выдзяляліся асобныя ўчасткі. З узнікненнем баярскага пасадніцтва напрыканцы XI стагоддзя дзейнасць гэтай групы насельніцтва горада рэгулявалася выключна вечавымі парадкамі і была выключана з юрысдыкцыі князя [18, с. 114].

Канчанскаму насельніцтву проціпастаўлена насельніцтва соцен. На працягу XII стагоддзя ў Ноўгарадзе соценная сістэма падпарадкоўвалася княжацкім соцкім і тысяцкаму. Гэтае насельніцтва (рамеснікі і гандляры) было незалежнае ад баяр і падпарадкоўвалася княжацкаму апарату. Таму ў дачыненні да сацыяльнай структуры Ноўгарада тэрмін «пасадскае насельніцтва» не выкарыстоўваецца, паколькі пасада ў выглядзе асобнай горадабудаўнічай структуры ў Ноўгарадзе ў X – XV стагоддзях не існавала, а ў сацыяльным плане пасадскаму насельніцтву адпавядала насельніцтва соцен. Баярскія сядзібы наўгародскіх канцоў размяшчаліся цераспалосна з насельніцтвам соцен [18, с. 115].

Летапісных звестак аб полацкіх «канцах» не зафіксавана, аднак Г.В. Штыхаў мяркуе аб наяўнасці «канчанскай арганізацыі» Полацка на манер Наўгародскай, якая, на думку даследчыка, у Полацку не атрымала шырокага развіцця [30, с. 33, 130]. А ці магла яна існаваць увогуле?

Заўважым, што пісьмовыя крыніцы XV – XVI стагоддзяў і больш ранняга часу не паведамляюць аб наяўнасці «канчанскай» структуры Полацка. Полацкае баярства і вечавы лад да XII стагоддзя набылі вялікую магутнасць, аднак вялікай карпаратыўнасці баярскіх родаў накшталт наўгародскіх у Полацку не назіраецца. Інстытут княжацкай улады захоўваўся ў Полацку да канца XIV стагоддзя. Баярства як асобная сацыяльная група была юрыдычна адмежавана ад іншых груп пасадскага насельніцтва толькі ў 80 – 90-я гады XV стагоддзя. У гэты час абазначылася перавага баяраў над мяшчанамі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці Полаччыны [20, с. 66].

Інфармацыя аб арганізацыі вольнага насельніцтва Беларускага Падзвіння ў XI – XIV стагоддзях у рамках дзесяцічнай сістэмы – тысяча, сотні, дзесяткі ў пісьмовых крыніцах адсутнічае за выключэннем аповесці аб Святохне, праўдзівасць якой выклікае сумненні [30, с. 19]. У «Дэкрэце» Казіміра Ягелончыка 1486 года ўвядзенне ў Полацку дзесятнікаў разглядаецца як парушэнне даўняй мясцовай традыцыі [20, с. 45].

Адсутнасць соценнай структуры арганізацыі пасадскага насельніцтва Полацка ў XI – XV стагоддзях сведчыць аб іншай, у параўнанні з Ноўгарадам, сацыяльнай структуры пасадаў. Юрыдычная перавага полацкага баярства над мяшчанамі (як вызначальная рыса наўгародскіх канцоў) зафіксавана не раней за 80 – 90-я гады XV стагоддзя. Адсюль вынікае асаблівасць сацыяльнай арганізацыі пасадскага насельнітцва – соценная структура склалася ў Полацку толькі ў XVI стагоддзі, аб чым гаворка пойдзе ніжэй. Такім чынам, рэальных падстаў для вызначэння канчанскай арганізацыі насельніцтва Полацка няма.

**Кіраванне пасадскага насельніцтва.** Адна з галоўных прыкмет сярэдневяковага горада – гэта наяўнасць у ім гарадской абшчыны. Паводле М.М. Ціхамірава, П.П. Талочкі, Г.В. Штыхава і інш., аб наяўнасці на пасадзе самакіруемай абшчыны сведчаць наяўнасць гандлёвай плошчы, узнікненне сядзібнай забудовы, якая падапарадкоўвалася законам горадабудаўніцтва, разгалінаванай гарадской інфраструктуры. На думку Т.С. Бубенькі, свабоднае насельніцтва гарадскіх пасадаў з'яўлялася галоўным валадаром пасадскай зямлі, з аднаго боку, і сацыяльнай арганізацыяй, якая адстойвала інтарэсы свабоднага пасадскага насельніцтва, – з другога [2, с. 151 – 152].

Канчанская структура прадугледжвала іншую сацыяльную арганізацыю – канчанскія жыхары былі залежным ад баярства гандлёва-рамесным насельніцтвам. Гэтае насельніцтва аказвала ўплыў і на іншыя свабодныя катэгорыі гараджан. У супрацьвагу гэтаму, карпаратыўнасць свабоднага пасадскага рамяства закладзена ў аснове існавання пасадаў [27, с. 147].

Аднак існаванне пасадскай абшчыны ў X – XIII стагоддзях не знайшло адлюстраванне на старонках гістарычных крыніц ні ў Полацку, ні ў іншых гарадах Русі. Даныя археалогіі адназначна ўпэўнена таксама не могуць сцвердзіць яе існаванне, яны прадстаўляюць толькі ўскосныя звесткі пра існаванне карпаратыўнасці пэўных рамесных спецыяльнасцяў. Прыкметы карпаратыўнай арганізацыі полацкіх рамеснікаў у X – XIII стагоддзях можна прасачыць па наяўнасці ў цэнтральнай частцы Вялікага пасада ювелірных майстэрняў у XII і ў XVII стагоддзях [9, с. 2 – 15; 24]. Сляды ювелірнай вытворчасці былі адкрыты падчас даследаванняў тэрыторый, на якіх у X – XIII стагоддзях размяшчаліся гарадзішча, вакольны горад, Запалоцце, Вялікі пасад. У Полацку паспяхова развіваліся і іншыя рамёствы, археалагічна вывучаны касцярэзныя, гарбарныя, кавальскія, златарскія і іншыя майстэрні XII – XVIII стагоддзяў. Найбольш уплывовымі рамеснымі карпарацыямі ў першай палове XVI стагоддзя з'яўлялася мясніцкая, якая не толькі забяспечвала мясам Полацк, але і ганяла скот на продаж у Вільню [4, с. 40].

Старажытная карпаратыўнасць рамеснай вытворчасці паступова ў XVII стагоддзі афармілася ў цэхавую арганізацыю, і ўласна горад паступова ператвараецца ў цэнтр субкультуры пэўных прафесійных груп. Гарадскія рамеснікі становяцца замкнёнай сацыяльнай адзінкай, што яскрава бачна на пры-

кладзе цэхавага ўладкавання – іх прадукцыя вырабляецца па замове шляхты і магнатаў, густы апошніх залежаць ад запатрабаванняў найперш еўрапейскай моды. Па вызначэнню П. Бэрка, «сістэма цэхаў спрыяла стварэнню рамеснікамі і гандлярамі агульнай культуры, адрознай ад культуры сялян» [3, с. 62].

У айчыннай гістарыяграфіі апошніх гадоў трывала замацавалася слушнае меркаванне, што тып сярэдневяковага заходнееўрапейскага места (ізаляванай у юрыдычным сэнсе ад наваколля абшчыны, якая карысталася правам на самакіраванне) не быў характэрны для Русі ў XI – XIII стагоддзях [19, с. 44 – 45; 29, с. 192]. Рускія «города» і зямля-воласць утваралі адно арганізацыйнае цэлае, а жыхары зямлі разам з насельніцтвам гарадоў мелі супольную назву («палачане», «меняне», «смаляне» і інш.). Насельніцтва зямлі ў арганізацыйным плане аб'ядноўвалася ў абшчыны (гарадскія і сельскія) і падпарадкоўвалася гарадской абшчыне старшага горада. Цэнтральны дзяцінец-«град» з размешчанымі каля яго пасадамі ўтвараў арганічнае цэлае з падпарадкаванай яму тэрыторыяй і з'яўляўся адзіным значным цэнтрам улады, рамяства і гандлю зямлі-воласці.

Паводле М.Д. Макарава, наданне Полацку магдэбургскага права прывяло да вылучэння мяшчанскай абшчыны са складу насельніцтва зямлі [20, с. 39, 68]. Пасля 1498 года ў склад мяшчанства ўвайшло ўсё насельніцтва горада за выключэннем духавенства і баяраў. На магдэбургскае права былі пераведзены такія катэгорыі насельніцтва, як жыхары вёсак, якімі валодалі мяшчане, і путныя слугі. Аляксандр Ягелончык забараніў баярам, вялікакняжацкаму намесніку і праваслаўнаму духавенству мець падданых у Полацку. Баяры павінны былі за выкуп вярнуць полацкім мяшчанам дамы, якія яны гвалтоўна «покупили». Былі створаны органы асобных гарадскіх улад [20, с. 69].

Мяркуемую мадэль соценнай структуры арганізацыі пасадскага насельніцтва гісторыкі атаясамляюць з наўгародскай [4, с. 63]. Так, у Ноўгарадзе вольнае, але не арыстакратычнае насельніцтва, аб'ядноўвалася ў 10 соцен і доўгі час падпарадкоўвалася непасрэдна князю. Гэту адміністрацыйную сістэму ўзначальвалі тысяцкі і дзесяць соцкіх. Тэрыторыя соцен і канцоў не мела дакладна акрэсленых межаў і паступова канцы пашыраліся за кошт тэрыторыі соцен. Ніжэйшым адміністрацыйным звяном было насельніцтва вуліц. Асноўнымі гаспадарамі канцоў было наўгародскае баярства, кожны канец меў сваё веча, саборны храм і канчанскі манастыр [19, с. 85].

Адсутнасць соценнай структуры арганізацыі пасадскага насельніцтва Полацка ў IX – XV стагоддзях сведчыць аб іншых, у параўнанні з Ноўгарадам, прынцыпах гарадскога кіравання. У Полацку з XI стагоддзя галоўную ролю адыгрывалі вольныя гарадскія абшчыннікі, аб'яднаныя ў гандлёва-рамесныя карпарацыі накшталт «братчын». Нездарма ў летапісе сярод усіх гарадоў Русі занатаваны звесткі пра існаванне полацкай «братьщины», якая збіралася каля Старой царквы Багародзіцы «в городе» на Пятроў дзень [15, стб. 495].

Аднак асобныя органы гарадскіх улад, якія б дзейнічалі пастаянна, у Полацку не былі створаны да часу ўвядзення магдэбургскага права. Згодна з пастановамі прывілея 1498 года ў Полацку ўводзіўся ўрад войта, якога прызначаў вялікі князь літоўскі. Войту перадавалася судзебная ўлада над насельніцтвам горада. Дзейнасць войта праводзілася сумесна з райцамі і бурмістрамі, якія вырашалі ўсе гарадскія справы [20, с. 69]. На справе ж да 1550-х гадоў функцыі войта выконваў ваявода, а гарадское самакіраванне ўзначальваў лентвойт. З 1558 года лентвойта прызначаў ваявода [4, с. 90].

Такім чынам, соценная структура арганізацыі пасадскага насельніцтва склалася ў Полацку не раней за XVI стагоддзе. Так, рэвізія 1552 года згадвае мяшчанскія дзесяткі і сотні (адпаведна і службовых асоб – дзесятнікаў і сотнікаў) [22, с. 1, 2, 6, 10]. Паводле пастановы ратушы ад 1638 года, будаўніцтва новага гарадскога паркана павінны былі «пилновати сотники, поручники и десятники» [1, с. 309]. Пры гэтым асабліва агаворвалася, што кожнаму ўладальніку гарадскога «пляца» ці яго часткі дакладна вызначалася месца і памер свайго кавалка сцяны: «и где которому будет назначено мейсце, тамъ, а негде индей маетъ свой парканъ ставить, а клетки мають быти не клинястые, але вздлужъ, абы клетками руму много не займовати, а въ клеткахъ мають стояки ставить …» [1, с. 309]. Сотнікі і дзесятнікі згадваюцца і ў крыніцах сярэдзіны XVII стагоддзя разам з гарадскімі шафарамі і паборцамі, якія ўсе «одноколвекъ приходъ и расходъ меских грошей въ рукахъ своихъ мели» [16, с. 253].

Паводле «Рэвізіі», кожны з пасадаў меў сваю ўнутраную арганізацыю: запіс 1540 года называе старосту Вастраўскага пасада Радыёна Клочнева [4, с. 63]. Апроч таго, у першай палове XVI стагоддзя і ў пачатку XVII стагоддзя склаўся падзел мяшчан па вуліцах. На жыхароў вуліц размяркоўваліся павіннасці, а вуліцы мелі сваіх старшынь [22, с. 9]. З дакумента 1621 года вынікае, што сходам полацкіх мяшчан на вул. Вялікай кіравалі «старшины мещанские» [6, с. 121].

Важнае значэнне для разумення сістэмы кіравання пасадскага насельніцтва мае дакумент «Постановене згодное од всего посполства полоцкого, абы сотники шторок новые оберанѕ были, и петидесятники, и десятники», які захаваўся ў складзе актавай кнігі полацкага магістрата за 1654 – 1657 гады. Так, 5 верасня 1656 года на сходзе ў ратушы прадстаўнікоў полацкіх мяшчан «обрали сотников и петидесятников для всякого дела, абы готовыми зъ сотнями были и послушенство врадовое полнили. То что обрали сотни, кои в сотню зарецкую Федора Гатовку, а петидесятником Семена Сысу, в сотню екиман-

скую сотником Якима Грочанина, а петидесятником […][6], в сотню заполоцкую сотником Федора Шапоньку, а петидесятником […да][7] Сивицкого сотником обрали, сотником Даниилу Лаптевича, а петидесятником […][8], на ме*й*сцу Гарбуза обрали сотником Гарасима Баханского и Малявко поданы*й* на тот же врад, на ме*й*сцу Сабура Шевца обран сотник Гаврыло Юрко, петидесятником Семен Попько, на месцу Павла […][9] Якубъ Юревич сотником, Павел До*й*ла петидесятником, на ме*й*сцу Тивуна Грыцко Коротки*й* сотником, петидесятником […][10] тых теды всиих особъ выше*й* помененых згоднена сотництво и петидесятництво о брацтвы …» [21, арк. 47, 47 адв.].

З тэксту дакумента вынікае існаванне сістэмы кіравання пасадскага насельніцтва ў межах пасадаў: Задзвінскага («сотня зарецкая»), Экіманскага («сотня екиманская») і Запалоцкага («сотня заполоцкая»). На кожны з гэтых двух пасадаў быў абраны адзін сотнік і адзін пяцідзесятнік. Астатняя частка абраных асоб, а менавіта шэсць сотнікаў і столькі ж пяцідзесятнікаў[11], была абрана ад «поспольства» Вялікага пасада. Гэтыя службоўцы павінны былі рабіць штогадовыя справаздачы аб усіх работах, гарадскіх даходах і расходах. Сотнікі, пяцідзесятнікі і дзесятнікі абіраліся не толькі для службы гораду, але і для выканання загадаў цара Аляксея Міхайлавіча. Кандыдатуры для абрання былі прапанаваны брацтвамі (цэхамі), што падкрэслівае вядучую ролю рамеснага насельніцтва ў жыцці горада. Найбольшая колькасць абраных кіруючых асоб ад Вялікага пасада сведчыць пра вядучую ролю і прадстаўнічасць яго насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным жыцці Полацка ў сярэдзіне XVII стагоддзя. Цікавым з’яўляецца факт вызначэння адной «зарецкой сотни» насельніцтва Крыўцовага пасада, што пацвярджае выказанае раней меркаванне аб наяўнасці ў першай палове XVII стагоддзя аднаго пасада замест пазначаных у Полацкай рэвізіі 1552 года Вастраўскага, Крыўцовага і Слабодскага [11, с. 237]. Экімань – былая юрыдыка езуіцкага калегіума – падчас вайны 1654 – 1667 гадоў і панавання ў горадзе Аляксея Міхайлавіча была падначалена гарадскому магістрату і набыла статус пасада.

**Заключэнне.** Такім чынам, развіццё пасадскай структуры Полацка прайшло шлях ад этапа станаўлення вакольнага горада, так званага «малога пасада», IX – першай паловы XI стагоддзя да ўзнікнення першых горадаўтваральных пасадаў – Вялікага і Запалоцкага ў другой палове XI стагодзя. «Канчанская» структура ў Полацку не склалася, што адрознівае Полацк ад гарадоў-дзяржаў Ноўгарада і Пскова. У Полацку з XI стагоддзя галоўную ролю адыгрывалі вольныя гарадскія абшчыннікі, аб’яднаныя ў гандлёва-рамесныя карпарацыі накшталт «братчын». Мяшчанская абшчына была вылучана са складу зямлі-воласці толькі пасля надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.). Пасля 1498 года ў склад мяшчанства ўвайшло ўсё насельніцтва горада, за выключэннем духавенства і баяраў. Юрыдычная перавага полацкага баярства над мяшчанамі зафіксавана ў пісьмовых крыніцах не раней за 80 – 90-я гады XV стагоддзя. У першай палове XVI стагоддзяў Полацку склалася так званая «соценная» сістэма арганізацыі пасадскага насельніцтва. Апошняя акалічнасць істотным чынам адрознівае Полацк ад рэгіёнаў Паўночнай Русі, дзе «соценная» сістэма існавала з XII стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. – Вильна, 1867. – Т. 1. – 409 с.
2. Бубенько, Т.С. Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.): моногр. / Т.С. Бубенько. – Витебск: Изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2004. – 276 с.
3. Бэрк, П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / П. Бэрк. – Мінск: Тэхналогія, 1999. – 380 с.
4. Варонін, В.А. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / В.А. Варонін. – Мінск, 2000. – 109 с.
5. Витебская старина / сост. А. Сапунов. – Витебск: Типо-литогр. Г.А. Малкина, 1885. – Т. IV – 394 + XII с.
6. Витебская старина / сост. А. Сапунов. – Витебск: Типо-литогр. Г.А. Малкина, 1888. – 670 с. + 40 л. ил.
7. Дук, Д. Да пытання тапаграфічнага развіцця Вялікага пасада Полацка ў XI ст. / Д. Дук, С. Тарасаў // Гіст.-археал. зб. – 2005. – № 20. – С. 163 – 168.

[6] Прапушчана адно ці два словы.
[7] Прапушчана адно ці два слова і далей зацёрта прыкладна 2 словы.
[8] Прапушчана адно ці два словы.
[9] Прапушчана адно ці два словы.
[10] Прапушчана адно ці два словы.
[11] У тэксце згадана пяць пяцідзесятнікаў, верагодна, частка тэксту з імём шостага пяцідзесятніка пашкоджана.

8. Дук, Д. Аб полацкім некропалі Х – ХІІІ стст. / Д. Дук, М. Плавінскі // Гіст.-археал. зб. – 2006. – № 22. – С. 173 – 186.
9. Дук, Д.У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д.У. Дук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2007. – № 1. – С. 2 – 15.
10. Дук, Д.У. Да вынікаў археалагічных раскопак на Запалоцкім пасадзе старажытнага Полацка ў 2004 г. / Д.У. Дук // Археал. зб / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі; уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск: Юніпак, 2006. – Вып. 1. – С. 52 – 57.
11. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.: іл.
12. Дук, Д.У. Новыя знаходкі рэнесанснай кафлі ў Полацку (да пытання аб сацыятапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада ў першай палове XVI ст.) / Д.У. Дук, С.А. Салаўёў // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси (к 60-летию О.Н. Левко): материалы по археологии Беларуси. – Минск: ГНУ «Ин-т истории НАН Беларуси», 2007. – № 14. – С. 215 – 221.
13. Дук, Д.У. Станаўленне Полацка ў IX – XIII стст. / Д.У. Дук // Беларус. гіст. часопіс. – 2007. – № 11. – С. 25 – 31.
14. Дук, Д. Старажытныя славяне полацкага гарадзішча (780 – 1310 гг.) / Д. Дук // Беларус. гіст. часопіс. – 2008. – № 7. – С. 21 – 27.
15. Ипатьевская летопись (полн. собр. рус. летописей). – М.: «Языки русской культуры», 1998. – Т. 2. – 648 с.
16. Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губерний Витебской и Могилёвской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Сазонова. – Витебск: Тип. Губ. правл., 1874. – Вып. 5. – 416 с.
17. Колединский, Л. Аксиомы, теоремы и софизмы в интерпретации становления Верхнего замка Витебска / Л. Колединский // Castrum, urbis et bellum: зб. навук. прац. – Баранавічы: Баранав. узбуйн. друк., 2002. – С. 219 – 231.
18. Колчин, Б.А. Археологии Новгорода 50 лет / Б.А. Колчин, В.Л. Янин // Новгород. сб. (50 лет раскопок Новгорода). – М.: Наука, 1982. – С. 3 – 137.
19. Куза, А.В. Древнерусские поселения / А.В. Куза // Древняя Русь. Город, замок, село / Археология СССР. – М.: Наука, 1985. – С. 39 – 135.
20. Макараў, М.Дз. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. / М.Дз. Макараў. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
21. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 1823. – Воп. 1. – Спр. № 1.
22. Полоцкая ревизия 1552 г. / к изд. подготов. И.И. Лаппо. – М., 1905. – 236 с.
23. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.
24. Тарасаў, С.В. Сядзіба полацкіх ювеліраў XII – XIII стст. / С.В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 267 – 272.
25. Тимощук, Б.А. Восточные славяне: от общины к городам / отв. ред. С.А. Плетнева / Б.А. Тимощук. – М.: Изд-во МГУ, 1995. – 261 с.
26. Тихомиров, М.Н. Древнерусские города / М.Н. Тихомиров. – М.: Гос. изд-во полит. лит., 1956. – 478 с.
27. Толочко, П.П. Древнерусский феодальный город / П.П. Толочко; АН УССР. Ин-т археологии; отв. ред. С.А. Высоцкий. – Киев: Наук. думка, 1989. – 256 с.
28. Фадеев, Л.А. Происхождение и роль системы городских концов в развитии древнейших русских городов / Л.А. Фадеев // Русский город: ист.-методолог. сб. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1976. – С. 17 – 31.
29. Фроянов, И.Я. Рабство и данничество у восточных славян / И.Я. Фроянов. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1996. – 512 с.
30. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.: ил.
31. Штыхов, Г.В. Прошлое города по археологическим раскопкам и летописям / Г.В. Штыхов // Полоцк: ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – С. 8 – 18.

*Пастуліў 03.11.2008*